## Што рабіць, калі да вас прыйшлі з ператрусам?

*(Парады ад старшыні юрыдычнай камісіі РПГА “Беларускі Хельсінскі Камітэт” Гары Паганяйла)*

Журналістаў апошнім часам нярэдка затрымліваюць, прапануюць даць тлумачэнні, патрабуюць праглядзець змест іх ноўтбукаў, камп’ютэраў, відэазапісаў, праводзяць ператрусы на іх працоўных месцах, у кватэрах… Пры гэтым мы часам сутыкаемся з сур’ёзнымі парушэннямі крымінальна-працэсуальнага заканадаўства супрацоўнікамі органаў крымінальнага вышуку. Як быць у гэтай сітуацыі?

**Памятайце пра арт. 27 Канстытуцыі РБ**

Журналіст, як і кожны грамадзянін Беларусі, мае права не даваць ніякіх тлумачэнняў, спасылаючыся на арт. 27 Канстытуцыі РБ і адпаведны артыкул Крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, які гарантуе ім права не даваць паказанняў супраць саміх сябе і блізкіх сваякоў.

**Патэлефануйце свайму юрысту і калегам, каб яны прыехалі**

Яшчэ адно правіла, якое варта мець на ўвазе: у выпадку правядзення следчых дзеянняў з удзелам журналістаў яны могуць па тэлефоне паведаміць пра гэта сваім блізкім, калегам, а таксама адвакату.

Журналіст мае права запрасіць свайго прадстаўніка да ўдзелу ў следчых дзеяннях, якімі б яны ні былі (ператрусы, затрыманні, допыты). Права нааказанне юрыдычнай дапамогі замацавана як ў Канстытуцыі, так і ў крымінальна-працэсуальным заканадаўстве. Чыненне перашкодаў юрыдычнай дапамозе забараняецца. Таму мець свайго знаёмага адваката ў нашых умовах проста неабходна. Гэта могуць быць і прафесійныя адвакаты, і прадстаўнікі БАЖ, якія валодаюць ведамі па аказанні прававой абароны калегам, а таксама прадстаўнікі праваабарончых арганізацый, якія могуць забяспечыць прадстаўніцтва гэтых грамадзян у органах крымінальнага пераследу, органах пракуратуры, КДБ.

Калі вы запатрабавалі, каб на следчых дзеяннях прысутнічаў ваш прадстаўнік, які можа прыехаць да вас у найбліжэйшы час (скажам, на працягу 20 хвілін), следчыя павінныя пачакаць яго і не распачынаць следчых дзеянняў. Прадстаўнік, як і панятыя, будзе сведкам таго, што ўсе следчыя дзеянні вяліся законна. Ён з’яўляецца гарантам таго, што не парушаліся вашыя правы і інтарэсы.

**Асобы, якія “суправаджаюць” следчага, не маюць права праводзіць ператрус**

Бывае, што разам са следчым, які павінен правесці ператрус у вашым памяшканні, прыходзяць яшчэ некалькі асобаў. Трэба ведаць, што ў вобшуку могуць браць удзел сам следчы, панятыя і спецыяліст, калі гэта неабходна.

Усе астатнія асобы, якія „суправаджаюць“, павінныя знаходзіцца па-за вашай кватэрай. З меркаванняў бяспекі супрацоўнік міліцыі можа знаходзіцца і ў кватэры, але пры гэтым ніякіх дзеянняў ажыццяўляць не можа.

Падчас ператрусу трэба вельмі ўважліва сачыць за дзеяннямі следчых, каб падчас яго вам не падкінулі кампраметуючых рэчаў. Ні ў якім разе не давайце ім магчымасці без нагляду перасоўвацца па кватэры.

**Перапішыце ўсё**

Найперш зрабіце выпіску з пастановы на правядзенне ператрусу, звярнуўшы ўвагу на наступныя пытанні: па якой крымінальнай справе праводзіцца вобшук; хто вядзе яго; хто прыцягнуты ў якасці спецыяліста, панятых; хто санкцыянаваў.

Пасля завяршэння следчых дзеянняў павінны быць складзены пратакол вобшуку. У ім абавязкова павінны быць адлюстраваныя тлумачэнні вашых правоў, правоў усіх дарослых

членаў сям'і, якія прысутнічалі пры вобшуку, таксама тлумачэнні магчымасці рабіць заўвагі на складзены пратакол і заносіць у пратакол скаргі на дзеянні следчага.

Толькі пасля ўнясення ўсіх вашых заўваг вам можна падпісаць гэты дакумент і запатрабаваць ягоную копію. Калі для вашых заўваг у пратаколе не хапае месца, можна запатрабаваць, каб іх унеслі ў асобны пратакол. Следчы абавязаны скласці такі дакумент, у ім вы павінны распісацца, а следчы павінен цягам 24 гадзін перадаць вашу скаргу і свае тлумачэнні пракурору па наглядзе. Апошні абавязаны правесці праверку скаргі і прыняць меры пракурорскага рэагавання.

Калі копію зрабіць няма тэхнічнай магчымасці, то варта максімальна дакладна перапісаць усе дадзеныя следчага і панятых з пратаколу, а таксама ўнесеныя вамі заўвагі і асноўныя вынікі следчых дзеянняў. Напрыклад, якія рэчы апісалі і забралі. Усё гэта можа вам дапамагчы пры складанні скаргі ці ў размове з вашым юрыстам.

Напісаць скаргу на дзеянні следчых можна і самастойна пасля завяршэння следчых дзеянняў. Адрасаваць такую скаргу трэба тэрытарыяльнаму пракурору: калі вобшук праводзілі супрацоўнікі раённай міліцыі ці КДБ, то скаргу належыць накіроўваць раённаму пракурору, калі следчыя былі з гарадскіх праваахоўных органаў — гарадскому пракурору, калі з абласных — абласному, і г.д.

Калі адказ пракурора па наглядзе вас не задаволіў, вы маеце права абскардзіць яго ў вышэйшага пракурора ці праз суд. Паводле практыкі, найбольш эфектыўна скардзіцца праз суд. Менавіта там вы можаце галосна заявіць сваю скаргу на дзеянні следчага, які павінны будзе даказваць, што дзейнічаў у межах закону.

**Следчыя могуць весці відэазапіс, але вы маеце права заявіць пратэст супраць яго публічнага выкарыстання**

Відэазапіс следчых дзеянняў можа праводзіць спецыяліст, чыё імя і прозвішча павінна быць унесена ў пратакол. Пярэчыць супраць гэтага даволі складана, але можна патрабаваць, каб гэты відэазапіс выкарыстоўваўся толькі як спосаб фіксавання следчых дзеянняў, бо такі запіс у любым выпадку закранае таямніцу прыватнага жыцця. Каб пазбегнуць выкарыстання запісу, напрыклад, на дзяржаўным тэлебачанні, неабходна самастойна (калі гэтага не зрабіў следчы) напісаць ў пратаколе, што вы забараняеце выкарыстоўваць запіс.

**Вы маеце права патэлефанаваць**

Усе патрабаванні адключыць на час вобшуку мабільныя і хатнія тэлефоны, забарона на тэлефонны званок сваякам, калегам ці адвакату — супрацьзаконныя. Калі следчы жадае захаваць таямніцу следчых дзеянняў, ён павінен папярэдзіць вас пра гэта, і тады вы не маеце права распаўсюджваць гэтую інфармацыю. Такую падпіску аб неразгалошванні следчы можа запатрабаваць. Але тэлефанаванне юрысту, сваякам, суседзям, якія, дарэчы, могуць быць панятымі замест тых, якіх следчыя прывялі з сабой, вам павінны дазволіць. Калі следчы патрабуе адключыць тэлефон, вы маеце права не падпарадкоўвацца яго патрабаванню. Вам неабходна патлумачыць яму, што такія патрабаванні незаконныя. Яшчэ раз падкрэсліваю: настойвайце на тым, каб у следчых дзеяннях прымаў удзел ваш знаёмы адвакат ці юрыст у якасці вашага прадстаўніка.

**Перагрус могуць правесці і без вашага ўдзелу**

Перагрус у вашай кватэры можа праводзіцца і без вашага ўдзелу, у прысутнасці любога поўнагадовага чальца сям'і, які жыве ў кватэры. А калі абставіны справы дыктуюць неабходнасць тэрміновага правядзення такога вобшуку, а нікога ў кватэры няма, тады выклікаюць прадстаўнікоў жыллёва-камунальнай службы, панятых… Органы, якія праводзяць следчыя дзеянні, маюць права нават узламаць дзверы вашай кватэры. Але толькі тады, калі ў іх ёсць важкія доказы таго, што ў вашай кватэры, напрыклад, хаваецца злачынца, захоўваюцца скрадзеныя рэчы ці знаходзіцца зброя.